

# ТРАЦЦЯК
# Іосіф Казіміравіч

Нарадзіўся ў 1920 годзе ў вёсцы Вейшычы Зэльвенскага раёна.

Свой працоўны шлях пачаў 16-гадовым юнаком. Працаваў спачатку вучнем каваля, а пасля стаў самастойна працаваць калгасным кавалём. Выйшаўшы на заслужаны адпачынак, застаўся верным прафесіі і рабочаму месцу. За шматгадовую працу ў калгасе зарэкамендаваў сябе вопытным работнікам, майстрам сваёй справы.

Іосіфу Казіміравічу прысвоена званне “Ударнік камуністычнай працы”. За праяўленую працоўную доблесць узнагароджаны юбілейным медалём да 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна.

Пастановай праўлення калгаса, партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 18 лютага 1985 г. пратакол №1 Траццяк І.К. занесены ў Кнігу Працоўнай Славы калгаса.